На первый взгляд проблема эта — тифлосурдопедагогика — кажется очень узкой, чисто специфической: ведь слепоглухих детей, а значит, и немых, к счастью, очень мало, и сам термин, означающий науку о воспитании слепоглухих, известен весьма немногим. Однако именно узким техническим проблемам преодоления этого тяжкого недуга посвящается большинство научно-популярных публикаций. Пожалуй, упомянутая выше четверка слепоглухонемых ученых-психологов стала широко известной в мире именно потому, что они не видят, не слышат, «говорят» искусственно поставленным голосом, не слыша себя. Как они общаются, как ориентируются в пространстве, насколько это трудно — вот что оказывалось в центре внимания многих авторов и читателей.

Думаю, чрезмерная дань такому любопытству вовсе не оправданна.

Ведь не хромотой велик Байрон, не глухотой — Бетховен, и никого не интересуют клинические особенности их дефектов. Но увлекаясь ими, мы забываем о самих людях. Так, слепота и глухота заслоняют от нас богатейший внутренний мир личности, яркий и многогранный. Фильм «Прикосновение» восполняет этот пробел.

Именно поэтому, на мой взгляд, он собирает неизменно огромную аудиторию очень взыскательных и квалифицированных зрителей.

Какую же проблему молодой режиссер и слепоглухой сценарист сделали главным героем своего фильма?

Потеря зрения и слуха сразу после рождения, до начала постижения младенцем видимого и слышимого мира, — трагедия только для родителей. Если такой ребенок усилиями педагогов обретает сознание, он все-таки не понимает во всей полноте своей беды: то, чего не успел приобрести, потерять нельзя. Но утрата красок и звуков мира для сформированного сознания — удар почти непереносимый. И чем совершенней сознание, тем острее осознание потери. О безысходности горя и написал в свое время двадцатилетний Саша Суворов своему старшему другу и учителю, замечательному советскому философу Эвальду Ильенкову. Ответ учителя и заключает в себе всю проблематику фильма, которая оказывается едва ли не главной проблемой человеческого бытия:

— Дорогой ты мой человек, на проблемы, которые ты поставил, думаю, сам Гегель не сумел бы дать окончательного и бесповоротного ответа. По существу, ведь речь идет о том, зачем человечество вообще вышло из животного состояния и обрело такую хлопотную способность, как сознание... Зачем существует солнце? Зачем существует жизнь? Любой ответ на эти вопросы будет относиться к области фантазии, плохой или хорошей поэзии. Таких ответов навыдумывано миллион, иногда остроумных, иногда — тупых. И пессимистических, и казенно-оптимистических.

Единственно, на чем может тут сойтись материалист с идеалистом или фантазером, так это то, что сознание — как величайшее из чудес мироздания — необъяснимо (только, пожалуй, кибернетики считают, что им раз плюнуть, чтобы его объяснить).

Сознание — не только чудо из чудес. Это и крест, и гораздо больший — для мыслителей... Всерьез полагают, что без этого «проклятого» дара божьего человек был бы счастливей и что вся боль мира существует, собственно, только в сознании. Недаром ведь, когда вырезают хотя бы аппендикс, стараются на это время сознание погасить...

Итак, новый талантливый фильм — о мужестве сознания, о чести человека гордо нести это хлопотное бремя, о битве за право быть частью человечества, за право каждого разделить это счастье.

Александр ВЕЛИКОРЕЧИН.

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА Ў ТВОРЧЫМ СПАБОРНІЦТВЕ

СІЛА ДУХОЎНАГА ГУРТАВАННЯ

Сярод фенаменальных і ў многім незаменных уласцівасцей літаратуры ёсць і такая: яна — гэта адзначаў яшчэ М. Горкі — «лягчэй і лепш за ўсё знаёміць народ з народам». Успомнім купалаўскае:

А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе!
Беларусы.

Вуснамі паэта, усёй яго творчасцю заявіў аб сабе народ, які выходзіў на сцэну чалавечага быцця, шырока ўзнімаўся да сацыяльна-гістарычнай творчасці. Пра беларусаў пачулі — спачатку бліжнія суседзі, а потым і іншыя народы. Беларус са сваімі імкненнямі, спрадвечнымі спадзяваннямі адкрываўся свету праз творчы геній сваіх пісьменнікаў, якія знаёмілі яго з чалавецтвам.

Цэлы народ праз родную літаратуру ўзнімаўся да сацыяльнай і нацыянальнай свядомасці, уключаўся ў сусветны гістарычны працэс, знаёміўся з народамі свету, якія сваёй духоўнай падтрымкай, сваімі літаратурамі садзейнічалі яго росту.

Гэты працэс рэзка паскорыўся з перамогай Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, якая пацвердзіла даўнюю ісціну, што ў кожным народзе (а яны знаходзіліся на розных ступенях гістарычнага развіцця) заключаны вялікія творчыя сілы і ўнутраныя патэнцыі, якія складаюць нацыянальную своеасаблівасць і перспектывы на будучыню. Вялікі Кастрычнік згуртаваў у адну сям'ю звыш ста нацый і народнасцей СССР. Дружба народаў стала асновай асноў маладой Краіны Саветаў, асновай развіцця яе культуры і літаратуры.

Вялікі Кастрычнік зблізіў народы СССР, усё больш і больш вызначалася тое агульнае — у лёсе, жыцці, культуры, што яднала беларусаў з рускімі, украінцамі, грузінамі і іншымі народамі. З цягам часу агульнасавецкія рысы ў жыцці кожнага народа краіны набываюць усё большае значэнне, што, зразумела, не можа не ўплываць на змест і форму твораў літаратуры, аднак паняцці «нацыянальная своеасаблівасць», «нацыянальны характар» не губляюць свайго рэальнага, напоўненага жыццём зместу. Інтэрнацыяналізм не толькі не адмяняе прынцыпу нацыянальнай прыналежнасці, але і зыходзіць з яго. Сацыялістычная па зместу, мнагастайная паводле сваіх нацыянальных мастацкіх форм, інтэрнацыяналісцкая па духу і характару савецкая літаратура становіцца вялікай сілай ідэйна-маральнага, духоўнага згуртавання нацый і народнасцей Савецкай краіны.

Інтэрнацыяналізм адметны тым, што ён, кансалідуючы нацыі, зыходзячы з пазіцый класавасці, сам прызнае вялікую каштоўнасць нацыянальных культур з іх самабытнасцю і непаўторнасцю. Гэта — ідэалогія духоўнага ўзаемапрыцягнення нацый і народаў і павагі да нацыянальнага, развіццё якога немагчыма па-за інтэрнацыянальным. Адно звязана з другім. Вядучая тэндэнцыя — збліжэнне нацый, у галіне культуры — праз узаемаўзбагачэнне іх духоўных набыткаў.

Сацыялістычны лад у гэтым працэсе выступае як рухавік і паскаральнік узаемаўзбагачэння і збліжэння, які развіваў і развівае ў савецкіх літаратурах лепшыя іх якасці, што і дапамагае росту іх мастацкага ўзроўню.

Беларуская літаратура, знаходзячыся на перакрыжаванні некалькіх культур, была і застаецца інтэрнацыянальна адкрытай. У 20-я гады больш выразным (нават з перабольшаннямі) стаў, у параўнанні з папярэднім агульнадэмакратычным перыядам, класавы характар яе інтэрнацыяналізму. Шлях да агульначалавечага ішоў праз класавае, якое ўключала ў многім і сферу мастацкасці. Умацаванне інтэрнацыянальных літаратурных сувязей вяло да з'яўлення міжнацыянальных стылявых рыс — такіх, напрыклад, як «касмізм», «планетарнасць» і г. д., якія былі для свайго часу гістарычна зразумелымі і апраўданымі. «Касмічны» погляд на чалавека несумненна садзейнічаў у пашырэнні грамадскіх далягляданў літаратуры, маштабаў мастацкага мыслення, хаця, з другога боку, не быў пазбаўлены і недахопаў, асабліва там, дзе забываўся на яго ўнутраны свет.

У 50-я — 60-я гады ізноў, на новай сацыяльнай аснове, касмізм, як вядома, асабліва глыбока закрануў творчасць літоўца Э. Межэлайціса і беларуса А. Куляшова і шмат у чым дапамог раскрыць вобраз сучасніка, шырокія «каардынаты» яго душы. Умоўная паэтыка ўвогуле, побач з формамі «жыццепадобнымі», займае даволі значнае месца ў беларускай літаратуры, скіраванай на асваенне сучаснасці, якая знаходзіцца на стыку мінулага і будучыні. Сёння, напрыклад, традыцыі А. Куляшова з уласцівай яму паэтыкай маштабных абагульненняў паспяхова працягвае і развівае здольны паэт М. Мятліцкі, якому вельмі характэрна імкненне да буйной метафарычнай вобразнасці.

На далонях — сонца нясу...

Устае агромністы шар,
Выкрасае з цемры красу,
Аздабляе свету абшар,
Асвятляе расу і слязу.

Касмічнае ў яго не адрываецца ад зямнога.

Інтэрнацыяналізм, трэба падкрэсліць, не мае нічога агульнага з касмапалітызмам, які ўсё нацыянальнае лічыць злом. Інтэрнацыяналізм і касмапалітызм — з'явы супрацьлеглыя. Касмапалітызм — родны брат нацыяналізму.

Творчыя індывідуальнасці беларускіх пісьменнікаў складваюцца з апорай на нацыянальныя традыцыі і на інтэрнацыянальныя сувязі з літаратурамі іншых братніх народаў.

Не адразу савецкая літаратура, у прыватнасці паэзія, успрымалася як многанацыянальная. Такое ўспрыманне прыйшло ў 30-я гады. Вялікую ролю ў гэтым працэсе адыграў Першы з'езд савецкіх пісьменнікаў, які вельмі зблізіў паэтаў Масквы і Ленінграда з паэтамі іншых рэспублік. Усталёўвалася «пачуццё сям'і адзінай». Шырока вядомымі сталі імёны Янкі Купалы, Якуба Коласа, Паўла Тычыны, Максіма Рыльскага, Егішэ Чарэнца, Галакціёна Табідзе, Сімона Чыкавані, Гафура Гуляма, Самеда Вургуна і іншых. У іх творчасці шмат агульнага, народжанага эпохай, пафаснага пазнання новага свету. Па-новаму прадстае праблема мастацкага перакладу.

Узаемапераклад — адна з актыўных форм інтэрнацыянальных літаратурных кантактаў. Значных поспехаў дасягнуў беларускі мастацкі пераклад у сучасную эпоху, стаўшы важнейшым каналам творчага супрацоўніцтва савецкіх літаратур і неад'емнай часткай літаратурнага працэсу.

Вельмі характэрнаю, вызначальнаю з'яваай стала ўзбагачэнне літаратур, узаемаўплыў, пашырэнне ў кожнай з іх тэматычнага кругагляду, узмацненне ідэйнага гучання. І велізарную ролю ў гэтым працэсе адыгрывае руская літаратура, на якую раўняюцца ўсе братнія літаратуры. Справа ў тым, што пераклад на рускую мову, як адну з міжнародных моў, з'яўляецца надзейнай пуцёўкай і да ўсесаюзнага, і да зарубежнага чытача. Нацыянальная своеасаблівасць беларускай літаратуры (у тым ліку і паэзіі), яе арыгінальнасць, непаўторнасць і «незаменнасць» павышаюць цікавасць да яе, садзейнічаюць выхаду да шырокага небеларускага чытача. Лепшыя творы беларускіх пісьменнікаў, перакладзеныя на рускую мову і мовы іншых народаў, становяцца здабыткам савецкага чытача.

Дарэчы будзе сказаць, што і беларускія паэты, заўважаецца, ахвотней за ўсё перакладаюць тых з сваіх паплечнікаў з іншых рэспублік, чые творы асабліва насычаны нацыянальным элементам у перадачы прыгажосці роднай зямлі, у выяўленні народнага характару. Мастацкі пераклад дапамагае ў пашырэнні арсенала выяўленчых сродкаў, далейшаму развіццю роднай мовы, розных яе літаратурных стыляў. Арыентацыя нацыянальных літаратур на ўсесаюзны ўзровень, г. зн. на адзіныя эстэтычныя крытэрыі, дапамагае выпрацаваць агульныя патрабаванні і да ідэйна-мастацкай якасці твораў, пераадолець пазакласавы падыход да мінулага, этнаграфічную апісальнасць, любаванне экзотыкай і архаікай.

Паняцце «кантакт літаратур» усё арганічней уключае іншае паняцце — «кантакт душ», аб'яднаных шчырай дружбай.

Дружба літаратур — не абстрактнае паняцце, а справа канкрэтных, жывых людзей. Яскравы прыклад вернага паэтычнага сяброўства — Аркадзь Куляшоў і Аляксандр Твардоўскі, чый мастацкі вопыт значна паўплываў на развіццё беларускай савецкай паэзіі. А. Твардоўскі адзін з першых у 30-я гады адчуў неабходнасць рашучага павароту да градыцый класікі, што выявілася ва ўзрастанні ўласцівага для яго творчасці суб'ектыўна-біяграфічнага эмацыянальнага пачатку, арыентацыі на класічную традыцыйнасць верша, адкрытага, аднак, для ўсяго новага, свежага, жывога. Рускі паэт зыходзіў з даверу да свайго асабістага вопыту, неад'емнага ад гістарычнага вопыту народа. Помнікам гэтай дружбы стала выдатная паэма А. Куляшова «Варшаўскі шлях», створаная ў 1972 годзе, — плён глыбокага роздуму паэта аб лёсе сучасніка, аб пытаннях жыцця і мастацтва, аб дарагой спадчыне, якую пакінуў пасля сябе А. Твардоўскі.

Аддана сябраваў Аркадзь Куляшоў і з другім рускім паэтам — Міхаілам Луконіным, што таксама спрыяльна адбілася на іх творчасці. Блізкія былі беларускаму паэту Андрэй Малышка, Мікола Нагнібеда, Кайсын Куліеў. «Наяўнасць вялікіх паэтычных талентаў у суседніх і больш аддаленых рэспубліках і гарадах краіны — асабліва калі ты яшчэ ведаеш гэтых людзей асабіста, — як правільна адзначае вядомы беларускі паэт А. Вярцінскі, — не можа не выклікаць жадання пісаць яшчэ лепш. Ідзе своеасаблівае міжнацыянальнае творчае спаборніцтва, дружалюбнае, узаемакарыснае...». Кніга таварыша, калі яна пасапраўднаму таленавітая, абуджае натхненне, выклікае жаданне ісці насустрач — пісаць свой твор.

Інтэрнацыяналізм — паняцце шматпланавае і разнастайнае. Гэта і тэматычная скіраванасць мастацкай творчасці, і ідэйна-маральная пазіцыя пісьменніка, якая адбіваецца на агульнай філасофска-эстэтычнай канцэпцыі твора, і спосаб мыслення. Тэматычная скіраванасць праяўляецца ў тым, што творы беларускай літаратуры нярэдка «насяляюць» героі розных нацыянальнасцей, што таксама сведчыць пра яе здольнасць да ўзаемаразумення, асваення дасягненняў іншых нацыянальных культур, тонкага ўспрыняцця іх ладу і духу.

Зрэшты, сказанае адносіцца не толькі да беларускай літаратуры. Ч. Айтматаў, кіргізскі пісьменнік, у рамане «Плаха» стварыў псіхалагічна вельмі праўдзівы вобраз рускага чалавека Аўдзія Калістратава. Пра гэта пісала руская крытыка.

Адданасць ідэалагічным каштоўнасцям свайго народа (любоў да працы, чалавечнасць, патрыятызм) дае магчымасць глыбей разумець культуру і жыццё іншых нацый і народнасцей.

Дружбу народаў і, адпаведна, іх літаратур, каб яна была сапраўднай дружбай, трэба пастаянна падтрымліваць канкрэтнымі справамі. Справа паэта — яго слова. У беларускай паэзіі заўсёды шмат важыла слова П. Панчанкі. Вельмі пранікнёна гучыць у яго слова дружбы, якое адлюстроўвае характар светаадчування паэта.

Якая ты бязмежная, Расія!
Тайга, і стэп, і цішыня, і гул...
Палкоў сібірскіх ведаем мы сілу,
Братоў імёны ў сэрцы берагу.
Шчаслівы я, што ўбачыць давялося
І Енісей, і харастко Саян,
Як там плыве ракою жоўтай восень
У цёмны і далёкі акіян.

Паэты іншых народаў плацяць нам узаемнасцю. Мяне хвалююць гэтыя вось радкі А. Шасцінскага — рускага паэта — з верша «Паклон Беларусі»:

Какое красивое слово
«Присады»!
Что значит по-русски
деревья вдоль сельской дороги.
Какие неисчислимые клады
скрывает
славянский колодец глубокий.
Слова берегите —
они самоцветы,
они самокаты,
они самоходы,
они самобеги
всегда и вовеки.

Калі ў 20-я—30-я гады ў асноўным вялікія культуры і літаратуры аказвалі ўплыў на малыя, дык сёння назіраецца таксама і адваротны ўплыў. Тая ж самая руская літаратура адчувае дабратворны ўплыў з боку іншых літаратур. Выступаючы на Другім з'ездзе пісьменнікаў Беларусі, А. Твардоўскі гаварыў: «Я люблю беларускую паэзію і ўжо пісаў пра тое, што мова майго дзяцінства блізкая да беларускай мовы... Мне заўсёды здавалася, і я працягваю так лічыць, што адметная якасць беларускай мовы — у яе відавочнай дэмакратычнасці... Нарадзіўшыся пад уплывам рускай літаратуры, яна — беларуская літаратура — спаўна вярнула рускаму чытачу панесеныя на яе «затраты»,.. гэта значыць яна сама аказвае ўплыў на рускую паэзію».

Выдатнае месца ва ўсесаюзным літаратурным працэсе займае творчасць Ч. Айтматава, А. Ганчара, Р. Гамзатава, Ю. Марцінкявічуса, М. Карыма, А. Чыладзе, Г. Матэвасяна, І. Друцэ, Т. Пулатава, О. Вацыеціса і іншых, якія складаюць значны духоўны патэнцыял у сваіх нацыянальных літаратурах.

У гэтым жа радзе — творчасць беларусаў М. Танка, П. Панчанкі, В. Быкава, І. Шамякіна, І. Чыгрынава, А. Кудраўца, В. Казько, В. Адамчыка і іншых.

Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ.

(Заканчэнне будзе).

ШЧЫРЫ РАДОК— НАШЧАДКАМ

Дабрадзейнасць, дабрачыннасць — словы гэтыя сёння зноў набываюць сваё колішняе значэнне. Найперш у сувязі з дзейнасцю Беларускага фонду культуры. Многія грамадзяне, асобныя калектывы не толькі пераводзяць грошы на яго рахунак, але і прымаюць удзел у шматлікіх платных мерапрыемствах, каб сродкі, сабраныя ад іх, ахвяраваць фонду. Менавіта такі дабрачынны вечар адбыўся ў Доме літаратара ў Мінску. Прайшоў ён пад дэвізам: «У спадчыну — шчыры радок».

Да вечара была падрыхтавана фотавыстаўка «Народныя святы і абрады» — некалькі яркіх старонак з жыцця народа, яго побыту, што так і просяцца ў дзень сённяшні. А хіба маглі пакінуць прысутных абыякавымі выступленні лепшых самадзейных калектываў рэспублікі — вілейскага гарадскога народнага хору «Світанак», харэаграфічнага ансамбля народнага танца «Карагод» Мінскага тонкасуконнага камбіната?!

Дабрачынны літаратурны вечар стаў вечарам шматлікіх прэм'ер. На ім свае новыя вершы ўпершыню прачыталі Максім Танк, Ніл Гілевіч, Рыгор Барадулін, Анатоль Вярцінскі, Яўгенія Янішчыц, Алесь Разанаў. Вёў вечар Уладзімір Някляеў.

Народны мастак Беларусі Леанід Шчамялёў падараваў фонду культуры тры свае карціны. За гэты дабрачынны акт старшыня праўлення Беларускага фонду культуры І. Чыгрынаў уручыў мастаку дыплом фонду за нумарам 1.

Сродкі ад вечара пойдуць на рэстаўрацыю Верхняга горада ў Мінску.

НА СЦЭНЕ ТЭАТРА ЮНАГА ГЛЕДАЧА

...Вопытны падарожнік па імені Піпс, які аб'ездзіў увесь свет, разам з неразлучнымі сябрамі папугаем і сабакам вырашаюць адправіцца на пошукі скарбаў. Але іх планы раптоўна рушацца — запаветную карту, на якой пазначаны клад, выкрадаюць хуліганы-хлапчукі.

Мноства забаўных сітуацый, жартаў, танцаў, музычных нумароў, клаунада... Камедыйны дэтэктыў для дзяцей па п'есе вядомага польскага сатырыка Стэфана Фрэедмана «Прыгоды падарожніка Піпса, папугая Тэрэ-Феры і сабакі Кліпса» пастаўлены на сцэне Беларускага тэатра юнага гледача ў жанры мюзікла. Яркае святочнае афармленне спектакля — заслуга мастака-пастаноўшчыка Малгажаты Валюшак, а рэжысёрам-пастаноўшчыкам стаў дырэктар Плоцкага драматычнага тэатра імя Ежы Шаняўскага Томаш Грахачыньскі.

— Работа з беларускімі калегамі пакінула ў мяне самыя лепшыя ўражанні, — сказаў ён. — Высокі прафесіяналізм акцёраў дазволіў здаць спектакль у самы кароткі тэрмін — усяго за месяц. Наступная сустрэча з беларускімі сябрамі назначана ў Плоцку. Мы запрасілі галоўнага рэжысёра тэатра Уладзіміра Караткевіча ставіць п'есу Святланы Алексіевіч «Марутка». А праз некалькі месяцаў зможам іграць змешанымі саставамі. Вядучыя акцёры тэатра юнага гледача і тэатра імя Ежы Шаняўскага, занятыя ў «Марутцы», памяняюць пляцоўкі. Думаю, што прамыя кантакты паміж тэатрамі будуць садзейнічаць творчаму росту абодвух калектываў.

САВЕЦКІЯ ПІСЬМЕННІКІ І ПЕРАБУДОВА

ШТО ЧАКАЕ АЎТАРА ПАСРЭДНАГА ТВОРА

Перамены, якія адбываюцца ў савецкай культуры, бадай, асабліва прыкметныя сёння на прыкладзе літаратуры. У гэтым можна пераканацца, параўнаўшы тое, што было да перабудовы, і тое, што адбылося за апошнія два гады.

Літаратурныя часопісы — перш за ўсё «Знамя», «Москва», «Наш современник», «Новый мир», «Октябрь», «Юность» — яшчэ два гады назад звычайна залежваліся на паліцах кіёскаў. Сёння іх разбіраюць за лічаныя мінуты, адразу ж пасля паступлення. Таму што сталі цікавымі. Таму што закранаюць праблемы, якія хвалююць чытача.

У кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў, яго часопісаў і выдавецтваў прыйшлі творчыя людзі, людзі новага мыслення. Хаця яны і не складаюць пакуль абсалютнай большасці, іх уплыў адчувальны. Зніклі распаўсюджаныя яшчэ нядаўна жанры, такія, як панегірык і дыфірамб і ў адносінах да асобных людзей, і ў адносінах да рэчаіснасці.

Знікаюць «белыя плямы». Пісьменнікі звяртаюцца да тэм, якія лічыліся яшчэ два гады назад забароненымі. Выдаюцца літаратары, якія яшчэ нядаўна знаходзіліся ў апале, творы якіх падвяргаліся астракізму чыноўнікамі і бюракратамі ад мастацтва.

Сёння службовы і іншы аўтарытэт ужо не пераважае над літаратурным. Сёння ўжо больш цяжка выдаваць актуальнасць за мастацкасць.

Характэрны і зусім нядаўні прыклад публічнасці і дэмакратызму — выбары кіраўніка маскоўскай пісьменніцкай арганізацыі, буйнейшай у Саюзе пісьменнікаў СССР. Вылучаюцца 8 (!) кандыдатаў. Чацвёра адразу заяўляюць самаадвод. Пяты — Анатоль Рыбакоў, аўтар бестселера «Дзеці Арбата», паведамляе аб самаадводзе тэлеграмай з ЗША, дзе знаходзіцца ў камандзіроўцы. Застаюцца трое. Крытык Аляксандр Міхайлаў, паэт Яўгеній Еўтушэнка, празаік Вячаслаў Шугаеў. Маецца на ўвазе, што працэдура выбараў на гэты раз будзе такая: кожны кандыдат азнаёміць пісьменнікаў са сваімі прапановамі аб удасканаленні дзейнасці маскоўскай арганізацыі, растлумачыць, навошта і з чым ён ідзе на адказную пасаду. Вострая, шчырая дыскусія працягваецца больш пяці гадзін. Вынік тайнага галасавання: за Міхайлава — 93 чалавекі, за Еўтушэнку — 55, за Шугаева — 15. Кіраўніком маскоўскай пісьменніцкай арганізацыі такім чынам стаў Аляксандр Міхайлаў. Ён, як і два яго «саперні-кі», — за перабудову і публічнасць у літаратурнай справе. Але не за паспешлівасць, хуткія рашэнні, вывады і дзеянні. Ён лічыць, што да дэмакратызму трэба ісці толькі дэмакратычнымі метадамі, што добрая мэта патрабуе і адпаведных сродкаў яе дасягнення.

Саюз пісьменнікаў СССР уключае ў сябе 15 саюзаў пісьменнікаў у саюзных рэспубліках, 20 саюзаў пісьменнікаў у аўтаномных рэспубліках, пісьменніцкія арганізацыі і аддзяленні ў аўтаномных абласцях, краях, буйных гарадах. У яго складзе прадстаўнікі 88 нацыянальнасцей.

СП СССР выдае 16 газет на 15 мовах народаў СССР і больш за 120 літаратурна-мастацкіх часопісаў і альманахаў на мовах народаў СССР і замежных. Яго цэнтральнае выдавецтва «Советский писатель» штогод выпускае па 500 і больш назваў кніг тыражом звыш 25 мільёнаў экземпляраў, з іх больш трэці — у перакладзе з моў народаў СССР. Рэспубліканскія арганізацыі СП маюць свае выдавецтвы.

У Саюзе пісьменнікаў СССР — 10 тысяч членаў. І сёння ўжо не сакрэт, што далёка не ўсе яны дастойныя называцца прафесіяналамі высокага рангу, як гэта абумоўлена ў статуце арганізацыі.

Аўтар у СССР атрымлівае ганарар за кнігу незалежна ад колькасці прададзеных экземпляраў. Добра гэта ці дрэнна, распускае пісьменніка ці дапамагае яго творчасці — прадмет сённяшніх гарачых спрэчак. Папулярныя пісьменнікі лічаць гэтую сістэму заганнай. Пісьменнікі ж сярэдняй рукі называюць кашчунствам усякае змяненне такога парадку. Парадак гэты і ўвогуле «гуманны» для іх: кніга чытабельная і нечытабельная выходзяць аднолькавымі тыражамі.

Але пазіцыі пасрэдных пісьменнікаў, галоўных пастаўшчыкоў «шэрай літаратуры», пахіснуты перабудовай. Кнігавыдавецтва перайшло ўжо на гаспадарчы разлік і самафінансаванне. І сутнасць перабудовы ў галіне якраз у павароце яе тварам да чытача.

Відавочна, што стваральнікі нечытабельных кніг — супраць такой перабудовы, супраць спаборнічання, супраць таго, каб тыраж твораў вызначаўся чытацкім попытам. Цяперашнія перамены ім зусім непатрэбныя. І ўвесь іх клопат пра тое, каб, як піша галоўны рэдактар часопіса «Знамя» Рыгор Бакланаў, «захаваць свае незаслужаныя прывілеі, той стыль работы і жыцця, калі нішто не калыхалася, але сыпаўся залаты дождж узнагарод».

Сёння становішча пасрэдных літаратараў сур'ёзна ўскладнілася. Заўтра яны, калі трымацца логікі падзей, стануць ужо нікому непатрэбныя.

Што ж рабіць тым, хто нічога, акрамя «шэрай літаратуры», стварыць не можа? На гэтае пытанне адказваюць і чытачы, і сапраўдныя пісьменнікі, літаратары - прафесіяналы. Яны прапаноўваюць кожнаму брацца толькі за сваю справу. У гэтым, уласна кажучы, сэнс перабудовы ўвогуле і ў літаратуры ў прыватнасці: кожнаму займацца толькі грамадска карыснай працай.

Гаўрыіл ПЕТРАСЯН.

ДА 150-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА

Людвіка Ямант (па мужу Радзевіч) нарадзілася каля 1840 года ў Вільні ў прагрэсіўнай сям'і, члены якой былі цесна звязаны з нацыянальна-вызваленчым рухам Беларусі і Літвы сярэдзіны XIX стагоддзя. Брат Людвікі — Іосіф Ямант (вучыўся разам з Кастусём Каліноўскім у Пецярбургскім універсітэце) на заключным этапе паўстання 1863—1864 гадоў на Беларусі і ў Літве быў рэвалюцыйным камісарам Мінскай губерні. Сястра Людвікі — Алена (нявеста саратніка К. Каліноўскага Цітуса Далеўскага) прымала актыўны ўдзел у рабоце віленскай рэвалюцыйнай арганізацыі, актыўным членам якой была таксама Людвіка Радзевіч.

Летам 1863 года ў доме Ямантаў у Вільні пасля прыезду з Гродна пасяліўся Кастусь Каліноўскі. Тут адбылося яго знаёмства яшчэ з адной сястрой Людвікі, Марыяй, якой Кастусь Каліноўскі потым прысвяціў верш «Марыська чарнабровая, галубка мая...». (Адзіны, які ўцалеў і дайшоў да нас).

Успаміны Л. Радзевіч напісаны, відаць, пасля вяртання з ссылкі ў пачатку XX стагоддзя. Засталіся неапублікаванымі. Рукапіс захоўваецца ў бібліятэцы імя Асалінскіх у Вроцлаве (ПНР). Публікуемы ўрывак з успамінаў Л. Радзевіч цікавы тым, што дадае невядомыя штрыхі да дзейнасці як самога К. Каліноўскага, так і блізкіх да яго на апошнім этапе паўстання людзей — Караліны Яцыны і Ядвігі Макжыцкай. Яны добра перадаюць атмасферу апошніх дзён паўстання 1863—1864 гадоў.

Кожнае слова пра Кастуся Каліноўскага, напісанае рукой яго сучаснікаў і паплечнікаў, нам, яго нашчадкам, дарагое тым, што дадае новыя рысы да вобраза нацыянальнага героя, 150-годдзе з дня нараджэння якога мы сёлета будзем адзначаць.

Вячаслаў ШАЛЬКЕВІЧ.

ЖМЕНЬКА ЎСПАМІНАЎ З 1863 ГОДА

Аднойчы раніцай я была разбуджана весткай, што ночу зграя жандараў нечакана з'явілася ў доме маіх бацькоў і пасля стараннага вобыску* ўсіх, хто быў там, пачынаючы з брата Юзэфа, арыштавалі, а дом апячаталі. Забралі бацьку і маці, людзей пажылых, вядомых і паважаных у горадзе, тры сястры: Марыю, Алену і Схаластыку (яшчэ непаўналетнюю), а таксама служанку Карусю. У апошні час маці, апасаючыся лішніх сведак дзейнасці і сувязей сына Юзэфа, выправіла мужчынскую прыслугу, а з жаночай пакінула толькі адну дзяўчыну. Маці не згадзілася на жаданне Юзэфа жыць асобна ад сям'і, як ён таго хацеў для бяспекі бацькоў.

Штохвілінна прыходзілі новыя, хутчэй трагічныя весткі.

Адначасова (з бацькамі) быў арыштаваны і Канстанцін Каліноўскі, які жыў пад прозвішчам Вітажэнца ў былых універсітэцкіх будынках, што прымыкалі да касцёла Св. Яна. Яго кватэру з асцярожнасці наведвала абмежаваная колькасць людзей, паколькі асоба яго — важная для справы — выключна аберагалася. Для сувязі з ім, дастаўкі яму і адсылкі яго карэспандэнцыі выдзелена была (арганізацыяй) цудоўная дзяўчына — Караліна Яцына.

Нечуваная па маштабу здрада Парфіяновіча ўскалыхнула ўсю Вільню. Немагчыма пералічыць усіх ахвяр, звязаных з ёю. Сярод іншых два браты Каліноўскія, сыны дырэктара дваранскага інстытута ў Вільні, Сілістроўскі Казімір, студэнт універсітэта, і столькі іншых, што нават знаёмых і родных — не ўсіх помню. З мінскай арганізацыі Аскерка, Свіда...

Цяжка сабе ўявіць больш страшнае становішча. Поўная разгубленасць у гэтым моры смутку і болю. Нялёгка было арыентавацца ў тых незлічоных ударах, што абрушваліся на горад. Каго аплакваць мацней? Каму больш спачуваць у няшчасці? Аб якой-небудзь дапамозе, акрамя дастаўкі ежы і задавальнення самых неабходных жыццёвых патрэб арыштаваных (нават далёка не ўсіх сваякоў), у той час нельга было і марыць.

У Кастуся Каліноўскага (жандары) спадзяваліся знайсці важныя дакументы, якія дарэчы, захоўваліся ў полай ножцы яго стала; аднак у момант вобыску яе не знайшлі, відаць

аб ёй не ведалі, а калі назаўтра жандары прыйшлі зноў, яна ўжо была пустая. Падвяргаючы сябе вялікай небяспецы, Яцына іх апярэдзіла.

У той жа дзень прыйшла да мяне развітацца, бо была ўпэўнена, што, вярнуўшыся дамоў, сустрэне жандараў. Прадчуванне не падманула яе! Гэта была наша апошняя сустрэча, бо неўзабаве пасля вяртання з Сібіры, дзе яна выйшла замуж за паляка Саковіча, Яцына памерла якраз перад самым нашым прыездам з ссылкі. Яе дачка Алена засталася ў Пярмі, далейшы лёс яе мне невядомы.

Дзейнасць Кастуся Каліноўскага, гэтай трагічнай ахвяры, добра вядома не з аднаго сачынення. Ён узвышаўся над іншымі не столькі з пункту гледжання вышэйшага становішча, якое займаў у рэвалюцыйнай арганізацыі, колькі як чалавек жалезнай сілы характару. Таму не буду спецыяльна спыняцца на паўтарэнні вядомых фактаў, падкрэслю толькі, што яго слава заслужана выключна дзейнасцю, а ў нашай сям'і ён быў надзвычай любімы за свае маральныя і душэўныя якасці.

Паколькі не меў у Вільні блізкіх, а сябры не маглі клапаціцца аб важных палітычных зняволеных, таму што гэта магло выклікаць ускладненне адносін, апеку над ім, наколькі гэта было магчыма, на выключна строгіх умовах, узяла на сябе асоба надзвычай дзейная ў той час, калі размова ішла аб дапамозе найбольш важным палітычным зняволеным, удава Ядвіга Макжыцкая**. Жанчына элегантная, немаладая, адукаваная, добра выхаваная, у сціплым адзенні, яна заўсёды знаходзіла магчымасць пракладваць шляхі там, дзе іншыя не маглі і падступіцца. Яе сэрца заўсёды рвалася на дапамогу тым асуджаным людзям, нават калі асабістае знаёмства з імі было самым нязначным.

Не прыпамінаю цяпер, як яна атрымала права дастаўкі Каліноўскаму неабходных рэчаў. Наладзіла пры дапамозе хабару жандарам магчымасць абмену сакрэтнымі запіскамі ў інтарэсах зняволеных, сярод якіх мела блізкіх знаёмых.

Вядома, тыя запіскі не мелі сапраўдных тайн, таму што на такую вялікую жандарскую паслужлівасць ніхто не спадзяваўся. Як высветлілася потым, асцярожнасць не была залішняй, бо былі доказы, калі запіскі, аплачаныя па 10 рублёў, часта траплялі да «нявіннага» Лосева (палкоўніка жандармерыі — **В. Ш.**) і толькі потым адрасату. У адной з гэтых запісак, якая несла няшчаснаму слабое дыханне жыцця і падтрымлівала ілюзорную сувязь з тым светам, куды ўжо не меў надзеі вярнуцца, помню яго (К. Каліноўскага — **В. Ш.**) словы: «Зайздрошчу свабодзе нават той вароны, якую са свайго акна бачу на снезе».

Макжыцкая, захоўваючы выключную асцярожнасць, хаця ўвогуле грэбавала асабістай бяспекай, старалася не паказваць сваю дасведчанасць пад маскай прастаты і наіўнасці ў палітычных справах. І хаця гэтым засцерагала сябе ад праследаванняў, бывалі выпадкі, калі яе выклікалі ў следчую камісію для тлумачэнняў. Зразумела, гэта былі размовы сумнага зместу, якія яна нам перадавала пасля вяртання з камісіі. Гэта быў сапраўдны паядынак дзвюх сіл з узаемным імкненнем ашукаць праціўніка. З аднаго боку, «дабрата і шчырасць» Лосева, з другога — «наіўнасць і прастата» Макжыцкай, пры дапамозе якой тая перамагала. Найлепшае сведчанне гэтаму выдаў сам «майстар хітрасці» (Лосеў — **В. Ш.**). Аднойчы пасля дарэмных, безвыніковых намаганняў звярнуўся да Югана (жандарскі паручнік — **В. Ш.**), які з цікавасцю прыслухоўваўся да размовы, сказаў раздражнёна і стомлена: «Comme elle est fin!» А можа быць, гэта быў жаль, што не меў дастатковых падстаў адправіць яе на шыбеніцу!

Людвіка РАДЗЕВІЧ.

*Тым не менш у жалабку пад акном мы знайшлі потым пячаць народнага ўрада. (Заўвага Людвікі Радзевіч на палях рукапісу. — **В. Ш.**).

** Яе сын Вацлаў, асуджаны да пакарання смерцю, уцёк, пераапрануўшыся, з Пецярбурга. Памёр у Дрэздэне. (Заўвага Людвікі Радзевіч на палях рукапісу. — **В. Ш.**).

ВЕЧАР, ПРЫСВЕЧАНЫ ЦІШКУ ГАРТНАМУ

Вечар, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння Цішкі Гартнага (Дзмітрыя Жылуновіча), адбыўся ў Доме літаратара ў Мінску. Дзяржаўны дзеяч, які стаяў ля вытокаў утварэння Беларускай ССР, аўтар першых значных твораў нацыянальнай пралетарскай літаратуры, даследчык рэвалюцыйнага руху ў Беларусі, адзін з першых акадэмікаў АН БССР, ён унёс значны ўклад у станаўленне і развіццё навукі і культуры ў рэспубліцы. Аб гэтым гаварылі першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Н. Гілевіч, пісьменнікі і крытыкі, прадстаўнікі грамадскасці.

ВІНШУЮЦЬ ЗЕМЛЯКІ

Віншую вас з надыходзячым Новым, 1988 годам! Жадаю супрацоўнікам рэдакцыі газеты «Голас Радзімы» ўсяго самага добрага ў жыцці. Выказваю вам сардэчную падзяку за газеты, кнігі і пісьмы, якія прыходзяць да мяне рэгулярна. Новых поспехаў вам, усёй Беларусі і Савецкай Радзіме! Няхай заўсёды будзе яснае неба над галовамі людзей на Зямлі! Няхай матэрыялізуюцца такія вядомыя ўсяму свету паняцці, як «мір» і «перабудова». Няхай будзе дружба паміж усімі краінамі і народамі!

Юрый РАСАДЗІНСКІ

Аўстралія.

Сардэчна віншуем рэдакцыю газеты «Голас Радзімы» з надыходзячым Новым годам! Жадаем асабістага шчасця, моцнага здароўя, умацавання сувязей з суайчыннікамі за мяжой і міру на зямлі!

Сям'я Таісы КУПЕРУС-МАРЧАНКІ.

Галандыя.

Дарагія сябры ў рэдакцыі газеты «Голас Радзімы»!

Дазвольце павіншаваць вас, а таксама ўсіх, хто жыве на тэрыторыі Савецкага Саюза, з Новым, 1988 годам. Жадаю вам вялікіх поспехаў ва ўсіх добрых справах!

Мікалай ВЯЕЎНІК.

Англія.

Дарагую рэдакцыйную калегію «Голасу Радзімы» сардэчна віншуем з Новым годам! Жадаем вам добрага здароўя і ўсялякіх поспехаў!

Віця і Янка ДУБЧОНКІ.

Англія.

Дарагія супрацоўнікі Беларускага таварыства «Радзіма» і рэдакцыі газеты «Голас Радзімы»!

Сардэчна віншую вас з Новым, 1988 годам! Жадаю вам, а таксама ўсяму савецкаму народу новых поспехаў у працы на карысць міру і прагрэсу. Добрага вам здароўя і вялікага асабістага шчасця! Няхай новы год будзе для ўсіх людзей нашай зямлі годам дружбы і супрацоўніцтва паміж народамі, годам міру і спакойнага жыцця!

Марыя ЛУЧ.

Бразілія.

Дарагія сябры!

Праўленне і члены Федэрацыі рускіх канадцаў г. Таронта сардэчна віншуюць супрацоўнікаў Таварыства «Радзіма» і рэдакцыі газеты «Голас Радзімы», увесь беларускі народ з Новым, 1988 годам! Жадаем моцнага здароўя, бадзёрага настрою, асабістага шчасця і поспехаў у працы, міру і працвітання! Няхай новы год умацуе мір і дружбу паміж народамі ўсёй зямлі, каб у кожнай сям'і былі любоў, спакой і шчасце!

З Новым годам!

Сакратар ФРК г. Таронта К. ЗВАНАРОВА.

Канада.

Паважаныя сябры з «Голасу Радзімы»!

Шчыра віншую з надыходзячым Новым годам!

Я ўпэўнена, што ў наступным годзе палепшацца адносіны паміж нашымі краінамі.

Візіт Міхаіла Сяргеевіча Гарбачова вельмі зацікавіў амерыканскі народ, а таксама ўсю грамадскасць Захаду.

Няхай будзе мір і дружба паміж народамі! Няхай заўжды вам спадарожнічае поспех!

Вера КЛАЦКО.

ЗША.

ЖЫВЕ СТАРАЯ ТРАДЫЦЫЯ

«КАЛЯДАЧКІ, ХОЦЬ НЯДЗЕЛЕЧКУ ПРАЦЯГНІЦЕСЯ...»

Заслаўе... Цудоўны, старажытны куточак Беларусі.

У адзін з апошніх дзён снежня яго жыхары і госці з беларускай сталіцы сабраліся ў мясцовым музеі рамёстваў і народных промыслаў, каб прыняць удзел у народжаным яшчэ язычніцтвам навагоднім радасным, карнавальным, песенным свяце Каляды.

Гурт калядоўшчыкаў выліўся на вуліцы і скрыжаванні Заслаўя. Год 1988, у адпаведнасці з народным уяўленнем, будзе заможным і шчаслівым, таму што быў спеты «Добры вечар, шчодры вечар» — магічная калядка. Ідэалізаваныя песенныя малюнкі аб працавітасці гаспадара, незлічоным багацці яго гаспадаркі, увішнасці гаспадыні, прыгажосці дачкі, смеласці сына павінны, паводле веры нашых продкаў у моц слова, стаць явай. А за такое цудадзейства трэба даць ахвяру — кавалак пірага, хлеба, каўбасы... У адным з вялікіх дамоў калядоўшчыкі атрымалі торт.

Асаблівую маляўнічасць каляднаму натоўпу надалі фігура Казы — сімвал урадлівасці, дух жытнёвага поля, Мядзведзь — наш славянскі тэтэмны продак, Жораў, Бацян, пакараныя за парушэнне прывычных норм людзей, Кабылка — водгук прыручэння дзікіх жывёл і ўвасабленне дабрабыту гаспадаркі, Зорка — знак сіл дабра і святла. Часта іх дапаўняюць гумарыстычныя вобразы павадыра Кабылкі цыгана і яго жонкі-варажбіткі, чорта, ведзьмы, знахара, доктара і многіх іншых персанажаў. Неад'емнай часткай Каляды з'яўляюцца карагоды, гульні. Асабліва шырока распаўсюджана на поўначы Беларусі загадкавая «Жаніцьба Цярэшкі» — водгук старажытнай эпохі дапарнай сям'і. У наш час яна ператварылася ў цэлы абрадавы гульнёвы калядны вечар з танцамі, карагодамі, калядкамі-цярэшкамі жартоўнага характару, заляцаннямі дзяўчат і хлопцаў. Не менш цікавымі з'яўляюцца калядныя гульні Яшчур, Жораў, Зязюля, Жаніцьба бахара...

Але ж у Калядзе ёсць і сапраўдны тэатр. Гэта імправізаваныя сцэнкі-дыялогі з гаспадарамі хаты саміх удзельнікаў калядавання, сярод якіх быў пачынальнік (знаўца абраду, найбольш дасціпны чалавек), запявала (музычна адораная асоба і знаўца калядак), музыканты (дудка, цымбалы, скрыпка, бубен), падхватнічкі, механоша. Часта гурты калядоўшчыкаў дапаўняліся лялечнымі або жывымі Батлейкамі.

Калядаванне ў Заслаўі стала прэлюдыяй да калядавання ў сталіцы Беларусі. Для падрыхтоўкі яго і будучых свят Беларускае аддзяленне Савецкага фонду культуры стварыла цэнтр па ўзнаўленню народных абрадаў. Прыгожы стары звычай Каляды па праву стаў першым у гэтым будучым многаабяцаючым ланцужку. У Мінск былі запрошаны лепшыя фальклорныя калектывы са своеасаблівага запаведніка калядавання — Піншчыны. Тры дні з вялікім поспехам спявалі калядкі, паказвалі найбольш цікавыя моманты Каляды таленавітыя спевакі з вёсак Дабраслаўка, Сташаны і Чухава. Свята было знята на кінастужку для паказу па тэлебачанні.

Васіль ЛІЦВІНКА.

НА ЗДЫМКАХ: святкаванне Каляды ў Заслаўі.

Фота Я. КАЗЮЛІ.

СПОРТ

У Львове напярэдадні Новага года завяршыўся розыгрыш Кубка СССР па стральбе з пнеўматычнай зброі. Гродзенскі спартсмен Ігар Басінскі ў стральбе з пісталета ўстанавіў рэкорд краіны, які на чатыры дзесятых ачка вышэй сусветнага...

Мы не выпадкова пачалі гаворку з апошняга выступлення гэтага спартсмена. Журналісты і аматары спорту на фінішы года дваццаць дзевяты раз вызначылі ў завочным рэферэндуме дзесятку лепшых спартсменаў Беларусі. Спіс узначаліў Ігар Басінскі.

Не пералічыць мінулагодніх перамог гэтага спартсмена. Літаральна на ўсіх буйных спаборніцтвах ён нязменна займаў першыя месцы. Прычым, як правіла, устанаўліваў сусветныя рэкорды.

Пераможнымі аказаліся для Ігара Басінскага выступленні на чэмпіянатах свету ў Хельсінкі і Еўропы ў Браціславе, міжнародным турніры ў ГДР, перадалімпійскім тыдні ў Сеуле...

Галоўны канкурэнт Ігара Басінскага — яго зямляк цяжкаатлет Аляксандр Курловіч — рэкардсмен свету. Дарэчы, у дзесятку лепшых увайшоў і яшчэ адзін штангіст — мінчанін Леанід Тараненка. Менавіта паміж гэтымі славутымі спартсменамі ішла вострая барацьба на першынстве краіны, міжнародных турнірах і афіцыйных спаборніцтвах самага высокага рангу.

З года ў год расце майстэрства тэнісісткі з Мінска Наталлі Зверавай. Юная беларуская спартсменка — зорка міжнароднага Уімблдонскага турніру сярод дзяўчат, увайшла ў лік шаснаццаці мацнейшых сярод дарослых. Наталля Зверава ў спісе лепшых спартсменаў рэспублікі па выніках мінулага года стаіць на трэцім месцы.

Хто яшчэ ў гэтым спісе? Назавём іх прозвішчы.

Марына Лобач (мастацкая гімнастыка), Вячаслаў Яноўскі (бокс), Ігар Жалязоўскі (канькабежны спорт), Алена Бялеўская (лёгкая атлетыка), Алена Марфель (стральба з лука), Марына Амяльянчык (воднялыжны спорт).

У апытанні на лепшага футбаліста БССР мінулага года перамогу атрымаў мінскі дынамавец Сяргей Гоцманаў.

І апошняе. Прэзідыум Федэрацыі футбола СССР на сваім пасяджэнні зацвердзіў спіс дзесяці лепшых суддзяў сезона 1987 года. Трэці радок тут займае мінчанін В. Жук.

ТАЛЕНТ — У СПАДЧЫНУ

Пацягацца са славутымі слуцкімі ткачыхамі пад сілу Аляксандру Казлову з вёскі Дразды Бешанковіцкага раёна, што на Віцебшчыне. Яго саматканыя дываны, посцілкі і абрусы радуюць вока ў дамах аднавяскоўцаў, ды і ўсёй акругі. Рамяство, якое лічыцца спрадвеку жаночым, запаўняе вольны час народнага ўмельца, які валодае такімі выключна мужчынскімі спецыяльнасцямі, як электрык, трактарыст, экскаватаршчык.

Любімы занятак дапамагае раскрыць усю паўнату і шматграннасць незвычайных здольнасцей таленавітага чалавека. Ён і канструктар, які распрацаваў праект самаробных кроснаў, і сталяр, які іх змайстраваў, і мастак — стваральнік самабытных узораў.

Захопленасць бацькі пераходзіць да дзяцей. У сына Юрыя, які таксама тчэ дываны, свая творчая манера, аднавяскоўцы сцвярджаюць, што ў майстэрстве і выдумцы малодшы Казлоў ніколькі не ўступае старэйшаму.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.

ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. № 2